Пролетары усіх краёў, злучайцеся

Чырвоная Зьмена

№ 97 (1366) ‖ АЎТОРАК, 28-га красавіка 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . . 30 кап.
3 месяцы . . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25.
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага №—2 кап.

Прывітальная тэлеграма А. М. Горкаму

Агульнагарадзкі сход пісьменьніцкіх організацый Менску вітае вас, нязломнага барацьбіта за пролетарскую рэволюцыю, старэйшага пролетарскага пісьменьніка.

Чакаем вас у Менску—сталіцы Савецкай Беларусі. Просім заехаць да нас.

Мы ўпэўнены, што і надалей голас Горкага будзе магутна гучэць у баёх за справу сусьветнага Кастрычніка.

Прэзыдыум сходу.

„Мы гатовы да бязьлітасных боек з тымі, хто пасьмее ўзьняць руку на бацькаўшчыну сусьветн. пролетарыяту“

Рапартуюць дэлегацыі замежных рабочых, якія прыехалі на Першамайскія сьвяты

Перад рашаючым выбарам

ХІ-ты пленум ВККІ у сваіх рашэньнях па дакладу тав. Мануільскага і садакладах т. т. Тэльмана, Ленскага, Чамаданава і Кашэна), ясрава адзначыў, што ня гледзячы на ўсе патугі соцыял-дэмократыі, якая зьяўляецца галоўнай соцыяльнай апорай буржуазіі, соцыял-фашыстых і іншых капіталістычных партый, нябачаны прамысловы і аграрны крызіс разрываюць капіталістычны сьвет. Бязупынна зьніжаецца вытворчасьць, рэзка зьніжаюцца патрэбы насельніцтва, скарачаюцца размеры ўнешняга гандлю, як ніколі абнішчалі сяляне ў зьвязку з падзеньнем цэн на сельска-гаспадарчыя тавары, высокіх падаткаў, запазычанасьцямі, арэнднымі плацяжамі і растаўшчыцкімі пазыкамі.

Буржуазія, шукаючы выхаду з ціскоў крызісу, выкідвае дзесяткі тысяч працоўных на вуліцу, зьніжае зарплату, павялічваючы падаткі на рабочую клясу, скарачэньне соцыяльнага страхаваньня, скарачае пакупныя плацежы асноўных продуктаў харчаваньне і сельска-гаспадарчай сыравіны. і г. д.

У нас-жа, ў СССР,—магутны ўздым прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. „Рост супярэчнасьці паміж сьветам капіталізму і сьветам соцыялізму, паміж дыктатурай буржуазіі і дыктатурай пролетарыяту крайне абвастрае небясьпеку ваеннай інтэрвэнцыі супроць СССР. Абвастрэньне клясавай барацьбы ў капіталістычных краінах, імкненьне буржуазіі выйсьці з крызісу за лік СССР, страх перад перамагаючым соцыялізмам, крушэньне тактыкі, разьлічанай на капіталістычнае перараджэньне СССР і патрымку адміраючых контр-рэволюцыйных клясаў (кулацтва, гарадзкая нэпманская буржуазія), вымушаюць сусьветную буржуазію перайсьці да тактыцы ўдара звонку шляхам экономічнай блёкады і ваеннай інтэрвэнцыі.“

ХІ-ты пленум ВККІ падкрэсьліў, што „разьвіцьцё клясавай барацьбы ва ўмовах далейшага разгортваньня сусьветнага экономічнага крызісу ставіць найшырэйшыя працоўныя масы перад **рашаючым выбарам: ці дыктатура буржуазіі—ці дыктатура пролетарыяту; ці экономічнае і політычнае нявольніцтва—ці канец капіталістычнай эксплёатацыі і прыгнечаньня; ці колёніяльная прыгнечанасьць і імпэрыялістычныя войны—ці мір і брацкія адносіны паміж народамі; ці капіталістычная анархію і крызісы—ці выключаючая анархія і крызісы соцыялістычная сыстэма гаспадаркі**“.

Рэволюцыянізіручыяся працоўныя масы ня вераць буржуазнай хлусьні аб „савецкім дэмпінгу“, „куцепаўшчыне“, „прымусовай працы“ у СССР і рэлігійным прасьледваньням,—кампаніям, якія зьяўляюцца падрыхтоўчай працай да вайсковай інтэрвэнцыі супроць СССР.

Організатар і натхніцель антысавецкай вайны, францускі імпэрыялізм і яго вярнейшы памоцнік—польскі фашызм ужо некалькі разоў вызначалі тэрміны абвяшчэньня вайны Савецкаму Саюзу. У Амэрыцы пад кіраўніцтвам ЛЕГГЕ (былы начальнік забесьпячэньня саюзных армій у імпэрыялістычную вайну) створана організацыя, якая закупіла на поўмільярда доляраў запасаў для здавальненьня патрэб інтэрвэнцыяністцкай арміі. Адсюль зусім ясрава, што ХІ-ты пленум ВККІ, адзначаючы, што ў радзе краін нарастаюць прадпасылкі рэволюцыйных крызісаў, ставіць пытаньне перад комуністычнымі партыямі аўладаць рашаючымі масамі пролетарыяту для барацьбы супроць вайны, супроць дыктатуры буржуазіі, за дыктатуру пролетарыяту.

У Фінляндыі разгортваецца антысавецкая кампанія

ГЕЛЬСІНГФОРС, 25. Антысавецкая кампанія, якая вядзецца ў Фінляндыі пад лёзунгам протэсту супроць „прасьледваньня інгэрманландцаў“ у СССР прыняла за апошнія дні выключна наглы характар. Кампаніяй кіруе спэцыяльна створаны „інгэрманландзкі камітэт“, які інцэніяваў шэраг „сходаў протэсту“ супроць „прыгнечаньня інгэрманландзіі“ савецкім урадам.

У „протэстах“ гаворыцца аб „росьце колектывізацыі“ і аб „высылцы інгэрманландцаў“. „Інгэрманландзкі камітэт“ уручыў фінляндзкаму ўраду зварот ад імя „інгэрманландзкага насельніцтва“, у якім сьцьвярджае што колектывізацыя сельскай гаспадаркі Карэліі „прадстаўляе сабой парушэньне Юр'еўскага дагавору“, а таксама „элемэнтарных патрабаваньняў гуманасьці і культуры.“ Зварот патрабуе, каб фінляндзкі ўрад выступіў перад савецкім урадам альбо Лігай нацыі ў абарону „інгэрманландзкага насельніцтва“.

Зварот падпісаны акрамя „інгэрманландзкага камітэту“ і „усходнякарэльскім камітэтам Карэльскага нацыянальнальна саюзу“, акадэмічным клюбам і шэрагам іншых антысавецкіх організацый, шэрагам політычных дзеячоў, у тым ліку гарадзкім галавой Гельсінгфорса, віцэ-старшынёй сейму, рэктарам Гельсінгфорскага ўнівэрсытэту і іншымі.

Патрэбна адзначыць што „інгэрманландзкі камітэт“ субсідзіруецца ўрадам.

Орган, які ўваходзіць ва ўрадавую коаліцыю прогрэсістых „Турун саномат“ надрукаваў гэтымі днямі рэзкую антысавецкую перадавую, якая падстракае да вайсковага нападу на СССР.

Ваенізацыя жанчын у Польшчы

Жаночы атрад „вайсковай падрыхтоўкі“ ў Польшчы. На здымку: асеньні агляд атрадаў у Варшаве пасьля звароту з лягераў.

Фінляндыя клапоціцца аб „прыгнечаных у СССР інгерманландцах“

ГЭЛЬСІНГФОРС. 25. Паводле паведамленьня соцыял-дэмократычнай газэты „Кансан Цое“, вялікую ролю ў антысавецкай кампаніі, ўзьнятай вакол „інгэрманладзкага пытаньня“ адыгрывае „акадэмічнае карэльскае таварыства“

Па словах газэты, гэтым таварыствам вядзецца узмоцненая агітацыя супроць СССР ва ўсіх буйных гарадох Фінляндыі. Праводзяцца сходы ў абарону „прыгнечаных у СССР інгэрманландцаў“

З свайго боку соцыял-дэмократычная газэта далучаецца да паклёпніцкай кампаніі сьвінхувудыстаў і прапануе утварыць „абследваньне“ ці сапраўды інгэрманландцы прыгнятаюцца

На сходах, склікаемых акадэмічным таварыствам, у сьлед за пагромнымі прамовамі супроць СССР. „не захоўваючага ўмоў дагавору“, як правіла, сьледуюць рэзолюцыі, ганьбуючыя „нячуласьць фінскага народу і ўраду“ і маючыя заклікі „папярэдзіць гібель інгэрманладзкага народу“

УВАГА: Акадэмічнае карэльскае таварыства зьяўляецца цэнтрам галоўных анты-савецкіх агрэсыўных сіл, у тым ліку былых удзельнікаў карэльскай авантуры 1922 году.

Антысавецкая брахня замежных організацый у Кітаі

ТОКІО, 23. З Харбіну паведамляюць, што разматыя замежныя організацыі ў Кітаі, у прыватнасьці, агенства Рэйтэр, распаўсюджваюць паведамленьні, што СССР, быццам, концэнтруе буйныя вайсковыя часткі на кітайскай граніцы і парушае пагранічную лінію, захапляючы вучасткі кітайскай тэрыторыі.

Цыцыкарская паўурадавая газэта высьмейвае гэтыя паведамленьні, называючы іх брахнёй. У доказ правільнасьці свайго пункту гледжаньня газэта паведамляе, што начальнік заставы кітайскіх войск ля станцыі Манчжурыя, з прычыны падобных чуткаў аб концэнтрацыі савецкіх войск у Абакатуе, організаваў спэцыяльную разьведку і пераканаўся, што чуткі гэтыя абсалютна хлусьлівыя.

Па Савецкім Саюзе

МАСКВА: Адкрылася першая ўсесаюзная выстаўка глісэраў. Мэта гэтай выстаўкі азнаёміць усялякія організацыі з магчымасьцю скарыстаньня глісэраў у рачных басэйнах Савецкага Саюзу.

ГОМЕЛЬ. Дзякуючы героізму рабочых і адміністрацыйнага-тэхнічнагэ пэрсоналу, Гомельская электростанцыя імя V гадавіны Кастрычніка першая ў БССР выканала пяцігодку ў 2 з паловай гады. Агульная продукцыя станцыі ўжо даведзена да 15 мільёнаў 695 тысяч кіловат-гадзін, замест 12 міл. 196 тысяч паводле пляну.

ХАРКАЎ. 25-га красавіка, як агульная, так і мэханізаваная дабыча вугалю ў Донбасе у параўнаньні з мінулымі сумамі павялічылася. Агульная дабыча павялічылася на 1,3 проц. а мэханізаваная на 2 проц. Усяго ў красавіку здабыта 17728 тон—71,4 проц. сутачнай програмы. Мэханізмамі здабыта 78830 тон—43,2 проц,

МАСКВА. 25-га красавіка ў Маскву прыбыла на першамайскія сьвяты аўстрыйская рабочая дэлегацыя. У складзе дэлегацыі знаходзіцца 14 соцыял-дэмократаў, 3 комуністых і 3 беспартыйных. Дэлегацыя складаецца з 8-мі мэталістых, 3-х чыгуначнікаў 2-х будаўнікоў, 2-х хэмікаў, гарняка, тэкстыльшчыка і 3-х працаўнікаў лекава-санітарных установаў.

„Мы гатовы стаць на абарону соцыялістычнага будаўніцтва“

КІЕЎ. 26. Прыбыла група нямецкіх чыгуначнікаў для ўдзелу ў першамайскіх у ачыстасьцях. Нямецкія чыгуначнікі зьвярнуліся да ўсіх рабочых СССР з прывітаньнем, у якім гаворыцца:

„Мы горача вітаем вас з чырвоным сьвятам сусьветнага пролетарыяту. Наша асабліва агністае вітаньне рабочым Масквы, Ленінграду, Баку, Кіеву, і шахцёрам шахты „Наклонной“ і багатыром рэволюцыі, героічнай калёне пераможцаў, выканаўшым пяцігодку за 2 з пал. гады. Гэтая перамога сьведчыць аб тым, што соцыялістычная індустрыя СССР за першыя два гады пяцігодкі гіганцкімі крокамі пайшла ўперад.

Ваша непахісная воля, беззаветная адданасьць пролетарскай рэволюцыі—зьяўляецца прыкладам для рабочых Нямеччыны. Мы вучымся ў вас як трэба змагацца для таго, каб перамагчы капіталістых, каб у недалёкім будучым пад сьцягам Леніна пайсьці на апошні штурм капіталізму.

Мы гатовы ў любую хвіліну грудзьмі стаць на абарону вялікага соцыялістычнага будаўніцтва.

Мы гатовы да бязьлітасных боек з тымі, хто пасьмее ўзьняць руку на бацькаўшчыну сусьветнага пролетарыяту!“

Юбілей „Чырвонай Зьмены“ перанесены на 10 мая

Пастанова камісіі ЦК ЛКСМБ па правядзеньні 10-цігадовага юбілею „Чырвонай Зьмены“

1. У зьвязку з тым, што большая частка раёнаў з прычыны паводак да 25 красавіка г. г. ня можа быць абслужана справаздачнымі дакладамі рэдакцыі, што рэгулярны выхад газэты „Чырвоная Зьмена“ часова спынены, сьвяткаваньне юбілею „Чырвоная Зьмена“ з 25 красавіка перанесьці на 10 мая 1931 г.

2. Тэрмін, што застаўся да 10-га мая комсамольскія організацыі павінны скарыстаць на больш пасьпяховае і шырокае разгортваньне падрыхтоўчай работы да сьвяткаваньня юбілею, мобілізаваўшы ўвагу, актыўнасьць мас комсамольцаў, рабочай і працоўнай моладзі на выкананьне і перавыкананьне пляну першага паўгодзьдзя 3-га рашаючага году 5-годкі, на пасьпяховае правядзеньне другой бальшавіцкай вясны, на 100 проц. ахоп комсамольцаў і моладзі ўдарніцтвам і спаборніцтвам, на ўзмацненьне работы па выкананьню лёзунгу IX-га зьезду УсеЛКСМ аб ператварэньні ленінскага комсамолу ў шматмільённую організацыю, выканаўшы пастанову Бюро ЦК ЛКСМБ аб даведзеньні тыражу „Чырвонай Зьмены“ да 60 тысяч.

3. Даручыць рэдакцыі „Чырвонай Зьмены“ асьвятляць на старонках газэты гістарычны шлях і разьвіцьцё „ЧЗ“ пасіліць асьвятленьне ходу падрыхтоўкі ў організацыях да юбілею, а таксама да 10 мая падвесьці вынікі (праз газэту) усіх мерапрыемстваў, высунутых у зьвязку з 10-цігадовым юбілеем „Чырвонай Зьмены“.

4. Прызначанае на 25 красавіка ўрачыстае паседжаньне ЦК, Менгаркому ЛКСМБ і рэдакцыі „Чырвонай Зьмены“, з удзелам КСМ актыву г. Менску, у зьвязку з 10-цігадовым юбілеем „Чырвонай Зьмены“—перанесьці на 10 мая.

„Пры кожным колгасе комсамольская ячэйка“

ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ КОЛГАСНЫХ ПАЛЕЎ У КОМСАМОЛ

„...Неабходна абвясьціць рашучую барацьбу опортуністычнай стаўцы на самацёк у росьце КСМ, паставіўшы баявую, конкрэтную задачу ператварэньне УсеЛКСМ у шматмільённую організацыю на бліжэйшы час“. (З рэзолюцыі IX зьезду ЎсеЛКСМ)

ЦК УсеЛКСМ у сваёй пастанове па дакладах комсамольскіх організацый: Украінскай, Ленінградскай, Іванаўскай, Ніжа-Гародзкай аб росьце адзначыў, што „тэмпы іх росту не забясьпечваюць ператварэньне комсамолу ў шматмільённую організацыю“ гэта ў поўнай меры адносіцца і да Беларускай комсамольскай організацыі.

Друкуемая сёньня рэзолюцыя бюро Менскага гаркамолу, якая з бальшавіцкай рашучасьцю адзначае „рост Менскай комсамольскай організацыі—нездавальняючы“ матар'ялы з Койданава, Суража, Межына,—яскрава сьведчаць аб слабасьці работы ў гэтым напрамку.

Яшчэ і зараз слаба разгортваецца масавая работа сярод рабочай, батрацкай, колгаснай і бядняцка-серадняцкай моладзі. Яскрывым прыкладам безадказнасьці ў гэтых адносінах можа служыць Межынскі райкомол, які 4 разы адкладваў конфэрэнцыю колгаснай і батрацка-бядняцкай моладзі раёну і нарэшце зусім... адмовіўся ад яе правядзеньня.

Валакіта, бяздушша і бюрократызм наглядаецца з боку некаторых ячэек і райкомолаў да афармленьня прыёму ў КСМ—заявы паступаючых марынуюцца ў ячэйках і РК па 6 і больш месяцаў не разгледжаным.

Патрэбна даць рашучы адпор тым, хто ігнаруе пастанову комсамольскіх зьездаў, аб 100 проц. уцягненьні рабочай моладзі ў комсамол, хто недаацэньвае важнасьць організацыі пры кожным колгасе—комсамольскую ячэйку, хто ставіць стаўку на самацёк у росьце саюзу.

Аб становішчы росту Менскай гарадзкой організацыі ЛКСМБ

Заслухаўшы і абмеркаваўшы пастанову ЦК УсеЛКСМ аб становішчы росту Ленінградскай і Украінскай організацыі, Бюро Менгаркому ЛКСМБ прызнае:

1. Становішча росту організацыі ЛКСМБ па г. Менску і прылягаючаму вясковаму раёну зьяўляецца яўна нездавальняючым.

а) Агульная колькасьць росту па гораду з 1 студзеня 1931 г. па 5 красавіка 31 г. г. (за тры з пал. месяцы) —дасягае ўсяго 1000 чал.

б) Пастаўленая мэта і распрацаваныя ў адпаведнасьці з гэтым шэраг мерапрыемстваў у галіне пасіленьня тэмпаў росту вясковай часткі організацыі—організацыя пры кожным колгасе яч. ЛКСМБ, найбольшы ахоп колгаснай моладзі комсамолам—не кантралююцца і па сутнасьці не выконваюцца. З моманту далучэньня да г. Менску прыгараднай вясковай нэрыфэрыі, гарадзкі камітэт не пераключыў практычна сваёй увагі на вырашэньне задач росту ЛКСМБ у вёсцы.

в) Гарадзкі Камітэт і пераважная большасьць арганізацыі ЛКСМБ яшчэ дагэтуль не ўключыліся ў праводзімы па ініцыятыве „Чырвонай Зьмены“ агляд—праверку становішча росту ў гор. Менску.

2 Дапушчэньне політычнай памылкі ў практычнай рабоце організацыйнага росту: шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на асваеньне комсамолам Меншчыны павышаных задач, высунутых перад комсамолам IX-м Зьездам УсеЛКСМ і першыя крокі організацыі па практычнаму іх ажыцьцяўленьню зусім недастаткова органічна зьвязваліся з барацьбой за шматмільённы комсамол, за ажыцьцяўленьне лёзунгу 100 проц. ўцягненьня рабочай моладзі ў комсамол.

а) Да практычнай рэалізацыі такіх мерапрыемстваў, як асваеньне тэхнікі, раз ортваньне плянава-опэрацыйнага і рацыяналізатарскага руху, пераход на гаспадарчы разрахунак,—недапушчальна слаба прыцягваюцца масы беспартыйнай рабочай моладзі.

б) Амаль зусім не прыцягнута рабочая моладзі да ўдзелу ў такім, важнейшага політычнага значэньня мерапрыемстве, як правядзеньне прамполітбою; адгэтуль—яўная небясьпека выхалашчваньня пастаўленай перад ім мэты.

в) Нездавальняючае ўцягненьне навічкоў ва ўсе праводзімыя практычныя мерапрыемствы, што зьяўляецца вынікам адсутнічаньня спэцыяльнай работы сярод уноў прынятых у комсамол.

3. Зусім недапушчальнымі зьяўляюцца факты адсутнічаньня ў Гаркоме вучоту базы росту ЛКСМБ, у асаблівасьці за лік рабочай моладзі і ФЗВ, прадпрыемстваў Меншчыны, вузлу МББ чыгункі, што ўскладняе пытаньне правільнай орыентыроўкі ў росьце організацыі, не дае магчымасьці своечасова рэагаваць на яе слабыя месцы.

4. Адзначыць наяўнасьць раду фактаў нецярпіма бюрократычных адносін з боку часткі колектываў (Абутковая ф-ка) і апарату Гаркому да справы хуткага афармленьня прыёму ў ЛКСМБ максымальнага зьніжэньня тэрмінаў прахаджэньня анкет. Лічыць, што прыймовая камісія Гаркому ў яе сучасным складзе ня можа забясьпечыць выкананьня задач шпаркага, разгорнутага росту ЛКСМБ.

Бюро Гаркому ЛКСМБ пастанаўляе:

1. Пасьпяховае выкананьне задач 3-га, рашаючага году пяцігодкі, практычнае асваеньне павышаных задач, пастаўленых перад організацыяй—неразрыўна зьвязана з барацьбой за шматмільённы комсамол, 100 проц. уцягненьне рабочай моладзі ў комсамол. Бюро Гаркому папярэджвае колектывы, ячэйкі, што надалей усе мерапрыемствы і практычная дзейнасьць організацыі павінна органічна пераплятацца з барацьбой за ажыцьцяўленьне лёзунгу 100 проц. ахопу рабочай моладзі комсамолам. Барацьба за выкананьне гэтага лёзунгу павінна зьявіцца выходным пунктам усіх праводзімых масавых гаспадарча-політычных мерапрыемстваў.

Бюро рашуча падкрэсьлівае, што менавіта барацьба за шматмільённы комсамол павінна зьявіцца магутным вагаром новай хвалі рэволюцыйнага энтузіязму і актыўнасьці шырокіх мас рабочай моладзі ў барацьбе за выкананьне пяцігодкі ў 4 гады, за пераход на яшчэ больш вышэйшую ступень свайго разьвіцьця соцыялістычных форм і мэтодаў працы.

2. Даручыць Орг. Аддз. неадкладна распрацаваць шэраг мерапрыемстваў практычнае ажыцьцяўленьне якіх забясьпечвала-б патрэбны пералом у пытаньнях росту як у горадзе, таксама ў саўгасе і колгасе на працягу мая месяца.

К-вам ЛКСМБ машынабудаўнічай, лёгкай прамысловасьці, Менскага вузлу МББ чыгункі, ФЗВ гэтых галін прамысловасьці і МШУ транспорту неадкладна разгарнуць шырокую масавую работу па ўцягненьню ў ЛКСМБ рабочай моладзі,—ухваліць і неадкладна шырока популярызаваць ініцыятыву к-ваў МШВ, МББ чыгункі, ФЗВ швэйнікаў аб організацыі масавага заклiку ў комсамол імя 10-ці годзьдзя ФЗВ.

3. Орг. Аддзелу неадкладна праверыць становішча работы з уноў прынятымі ў ЛКСМБ, забясьпечыўшы поўнае ўключэньне навічкоў у справу практычнага асваеньня павышаных задач комсамола: тэх. адукацыя, плянава-опэрацыйны і рацыяналізатарскі рух, пераход на гаспадарчы разрахунак, паляпшэньне якасьці ўдарніцтва і соц. спаборніцтва і г. д.

4. Даручыць Орг. Інст. аддз. пераглядзіць склад прыймовай камісіі Гаркому і свае прапановы па сутнасьці далажыць наступнаму пасяджэньню Бюро гаркому. Старшыню прыймовай камісіі ГК тав. Шымко зьняць з працы. Катэгарычна папярэдзіць адпаведных таварышоў з апарату ГК, к-вы і яч. аб забесьпячэньні максымальна шпаркага аформленьня прыёму ў комсамол.

5. 28 красавіка на Бюро ГК ЛКСМБ заслухаць паведамленьне тав. Рудніцкага аб ужытых захадах да рэалізацыі гэтай пастановы.

6. 20 мая на Бюро ГК заслухаць падрабязны даклад аб становішчы росту комсамолу Меншчыны гораду, па саўгасах і колгасах прылягаючага вясковага раёну.

Сэкратар Менгаркому ЛКСМБ
Янковіч.

ПАСТАНОВЫ ПЕРАТВАРЫЦЬ у конкрэтныя справы

Колгасная ячэйка ЛКСМБ (Барысаўскі раён) ня выконвае пастаноў 9-га і 10-га зьездаў комсамолу аб уцягненьні колгаснай і бядняцка-батрацкай моладзі ў комсамол. Праўда, калі-та на сходзе была вынесена пастанова аб тым, каб да 20-ІІІ-г. г. уцягнуць у комсамол 6 лепшых ударнікаў колгасу.

Але гэта пастанова так і засталася пастановай і да сучаснага моманту ня ўцягнута ніводнага колгасьніка. Таксама агульны сход пастанавіў склікаць сход колгаснай моладзі, але і гэтая пастанова да сяго часу ня выканана.

Наогул у ячэйцы наглядаецца ненармальнае зьявішча ў галіне росту, рост ячэйкі адбываецца не за лік колгасьнікаў, а за лік вучняў семігодкі.

Ячэйка не адпавядае сваей назьве—колгаснай, бо ў ёй маецца зусім нязначны процант колгасьнікаў.

К. Б.

Да адказнасьці валакітчыкаў

Зембінская комсамольская ячэйка, (Барысаўскі раён) не праводзіць ніякай працы з батрацка-бядняцкай і колгаснай моладзьдзю па ўцягненьню яе ў комсамол. Заявы, якія самацёкам паступаюць ад беспартыйнай моладзі аб прыёме ў комсамол па 6—8 месяцаў ляжаць у справах ячэйкі, а то проста ў кішэні сакратара. Так, напрыклад, у чэрвені месяцы мінулага году 5 колгасьніц колгасу „Савецкая камянка“ падалі колектыўную заяву ў комсамол. На сёньняшні дзень з з іх прайшлі толькі праз бюро ячэйкі.

У верасьні месяцы мінулага году піонэр-організацыя Зембіну перадалі ў комсамол 8 найлепшых піонэраў, з якіх да сучаснага моманту 4 чал. не зацьверджаны агульным сходам.

Некалькі месяцаў таму назад, бюро ячэйкі прыняла яшчэ трох асоб у члены ЛКСМБ, але былы сэкратар ячэйкі згубіў недзе пратакол і справа зусім заглохла.



Растуць горы заяў

Не застанаўлівацца на дасягнутым

Ня гледзячы на тое, што ў „Чырвонай Зьмене“ пісалася аб ганебным становішчы росту Лёзьненскай комсамольскай організацыі, многія ячэйкі гэты сыгнал не пачулі і не зрабілі пералому ў гэтай рабоце. Так ячэйкі Завольшо, „Чырвоны Араты“, „Сітна“, „Інтэрнацыянал“, „Чырвоны сьвет“, „Варашылава“ праўдзівую на раней шаму сваю сьпячку ў справе разгортваньня масавай работы сярод батрацкай і колгасна-бядняцкай моладзі і спадзяюцца на самацёк у пытаньнях росту.

Але частка ячэек у сувязі з сыгналамі „Чырвонай Зьмены“ заварушылася. Так ячэйка ільнозаводу імя Молатава за апошнія 2 декады ўцягнула у комсамол 10 чалавек рабочай моладзі, ячэйка „Профінтэрн“ за гэты-ж тэрмін вырасла на 15 чалавек колгаснай батрацкай і бядняцка-серадняцкай моладзі. Ячэйка „Полымя“ вырасла на 5 чалавек вучнёўская—на 5 чал., ячэйка колгасу „Прагрэс“—на 10 чал.

Заспакойвацца на гэтым нельга, Агульны рост організацыі Лёзьненскага раёну ўсё-ж нездавальняючы.

На апошнім сваім пасяджаньні бюро Лёзьненскага РК КСМ абвясьціла першамайскі заклік у шэрагі ленінскага комсамолу рабоча-батрацкай і бядняцка-колгаснай моладзі, які заклік павінен зрабіць пералом у становішчы росту Лёзьненскай комсамольскай організацыі.

Кароль.

ЛЁЗУНГІ ДА „ДНЮ ЛЕСУ“

1. „Дзень лесу“—грамадзка-політычны агляд організацыйных і вытворчых дасягненьняў лясной гаспадаркі і прамысловасьці.

2. „Дзень лесу“—дзень колектыўнай дапамогі комсамолу, рабочых, колгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага насяленьня лясной прамысловасьці і гаспадарцы.

3. Комсамол, піонэр і працоўная моладзь—у авангард кампаніі „дню лесу“.

4. Савецкая лясная гаспадарка ў справе пабудовы соцыялізму пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі—адна з сыравых баз індустрыялізацыі і соцыялістычнага будаўніцтва краіны. Больш ува і лясной гаспадарцы!

5. Сваячасовай падрыхтоўкай да летніх лесазагатовак на базе соцспаборніцтва і ўдарніцтва ліквідуем прарыў плянаў зімовых лесазагатовак.

6. Створым лясныя дрэвастаны на пяскох і пустках, перетворым іх з шкодных у карысныя плошчы.

7. Лясныя рабочыя і спэцыялістыя, усе на штурм адсталасьці лясной гаспадаркі. Машыны і трактар—у лес.

8. Зяленьня пошчы ў гарадох, саўгасах, колгасах і ў рабочых пасёлшчах—лепшы друг здароўя працоўных.

9. Створым паркі і сады—лепшыя месцы адпачынку і культуры працоўных мас.

10. Спынім самацёчныя пасечкі ў лясох мясцовага значэньня, організуем плянавую гаспадарку ў лясох мясцовага значэньня.

11. Лес—спадарожнік паляўнічай і пчалярскай гаспадаркі. Больш увагі гэтым галінам сельскай гаспадаркі.

12. У „дзень лесу“ праверым паўшырны ход працы соц.спаборніцтва і ўдарніцтва ў лясной гаспадарцы і прамысловасьці.

13. Пад выпрабаваным кіраўніцтвам комуністычнай партыі забясьпечым выкананьне ў лясной прамысловасьці пяцігодкі ў чатыры гады і выканаем промфінплян 3-га, рашаючага году пяцігодкі.

14. Праз соц.спаборніцтва і ўдарніцтва—павысім ураджайнасьць нашых лясоў і выкананьне плянаў лесазагатовак.

15. Больш увагі з боку грамадзкасьці ахове лясоў ад пажараў, спляву і лесааднаўленьню высечак і пустак.

Цэнтральная камісія па правядзеньню „дню лесу“

База для росту ёсьць, а росту ням[...]

Комсамольская організацыя К[...] дазаўшчыны пытаньнем выкана[...] ня пастаноў зьездаў аб перат[...] рэньні комсамолу ў шматмільённ[...] організацыю не займаецца. Р[...] праходзіць самацёкам амаль ва ў[...] ячэйках організацыі. Прывядзем [...] калькі лічбаў, якія з усёй яск[...] васьцю кажуць аб гэтым. З ліс[...] паду па красавік месяц 1931 го[...] організацыя вырасла на 164 ча[...] векі, з якіх рабочых і батракоў [...] 40, процант дзяўчат зусім нязна[...] ны; між тым, як з верасьня [...] лістапад месяц 1930 г. організац[...] вырасла на 200 чалавек, з я[...] 50 проц. рабочых і батракоў [...] 35 проц. дзяўчат. Тлумачыцца т[...] кое становішча тым, што ячэй[...] Гаркамолу зусім закінулі работу [...] беспартыйнай моладзьдзю па ўця[...] пеньню яе ў комсамол.

Такія ячэйкі, як МТС, дзе вя[...] кая база росту (120 чалавек) в[...] расла за апошні квартал толькі [...] 15 чалавек. Ружэмкальскі коле[...] тыў, дзе маецца рабочай мола[...] каля 60 чалавек, вырас за апош[...] квартал усяго на 15 т. т. Так[...] ячэйкі як Негарэлае чыг., колга[...] „Кастрычнік“, „Паланеводзкая[...] „Добрынеўская“, Вільшчынска[...] колгасу „Новае жыцьцё“ за гэ[...] квартал зусім ніводнага чалаве[...] ня прынялі. Пытаньне аб росту [...] аб рабоце сярод беспартыйнай м[...] ладзі не ставіліся ні ў адной з [...] тых комсамольскіх ячэек.

РК комсамолу таксама не прав[...] раў і яя кіраваў выкананьне ячэ[...] камі важнейшай настановы зьезд[...] аб 100 проц. уцягненьні рабоч[...] моладзі ў комсамол і організацыі [...] кожным колгасе комсамольск[...] ячэйкі. Толькі 5-га красавіка бы[...] пастаўлена гэтае пытаньне на бю[...] Гаркамолу, але рашэньне гэтае бю[...] не давялo да мас комсамольцаў [...] беспартыйнай моладзі

Макарэвіч.

Ігнoруюць работу з батрацка[...] бядняцкай моладзьдзю

Межынская комсамольская ра[...] організацыя не праводзіць ніяка[...] работы з беспартыйнай батрацк[...] бедняцкай і колгаснай моладзьдз[...] Рост комсамольскіх ячэек праходзі[...] самацёкам.

Цэлую зіму РК комсамолу зьб[...] раецца праводзіць конфэрэнцы[...] батрацка-бядняцкай і колгаснай м[...] ладзі і ніяк ня можа асьмеліц[...] яе склікаць—усё адкладвае. Апош[...] ні раз конфэрэнцыя была прызна[...] чана на 25-ІІІ-г. г., перанесьлі [...] на 3-IУ-г. Дэлегатаў ужо збрал[...] склалі грамадзкую думку вакол г[...] тай конфэрэнцыі, але і 3-га гэта[...] конфэрэнцыя не адбылася. Невядом[...] чаму РК ЛКСМБ адклаў гэтую кон[...] фэрэнцыю. Гэты факт зьяўляецц[...] ганебным, адштурхваючым батрацка[...] бедняцкую і колгасную моладзь а[...] комсамолу.

Аса

Організавалі новую ячэйку

Комсамольская брыгада ячэйкі саўгасу Бачэйкава (Бешанковіцкі р-н) выехала ў саўгас „Слабада“ з дакладам аб соцыялістычным будаўніцтве і аб задачах комсамолу. На сходзе прысутнічала больш 30-ці маладых колгасьнікаў і некалькі аднаасобнікаў. Пасьля сходу 12 колгасьнікаў падалі заяву аб уступленьні ў комсамол, сярод іх 4 дзяўчаты. Саўгасная яч-ка ўзяла шэфства над гэтай уноў організаванай ячэйкай.

Пост „ЧЗ“ Х. Глікман.

Месячнік вясеньняй пасеўнай трывогі комсам…

КОЖНЫ ДЗЕНЬ, КОЖНАЯ ГАДЗІНА ВЫРАШАЕ ПОСЬПЕХ…

Усю напорыстасьць і комсамольскі энтузіязм—на барацьбу за скарочаныя тэрміны сяўбы

Бальшавіцкімі тэмпамі скончыць кантрактацыю і пераход на зьдзельшчы…

Комсамол—ударнік зьдзельшчыны ў колгасах

Адным з галоўных вагароў організацыйна вытворчага ўмацаваньня колгасаў, організацыі масавага прыліву бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і пасьпяховага правядзеньня пасеўкампаніі—зьяўляецца тэрміновы перавод колгасаў на зьдзельшчыну па ўсіх відах работ. Ні аднаго колгасу, ні аднэй работы ў колгасе, якая не пераведзена на зьдзельшчыну да другой бальшавіцкай вясны,—вось лёзунг баявых дзеньняў комсамолу.

Комсамол у гэтай рабоце павінен адыграць вялікую ролю. Ячэйка комсамолу павінна дапамагчы колгасу выпрацаваць нормы і ацаніць кожную работу ў працаднёх, організаваць соцспаборніцтва і ўдарніцтва, стаць застрэльшчыкам-ударнікам у справе увядзеньня зьдзельшчыны і новых соцыялістычных мэтодаў працы.

Комсамол павінен наладзіць шырокую масавую работу з колгасьнікамі і даць рашучы адпор тым, хто агітуе супроць зьдзельшчыны, супроць норм выпрацоўкі і расцэнкі ў працаднёх.

Трэба добра памятаць, што барацьба супроць увядзеньня зьдзельшчыны ў колгаснай вытворчасьці ёсьць барацьба, накіраваная супроць колгасу, за яго развал. Таму грош цана тэй ячэйцы, якая ў сваім колгасе не ўвяла зьдзельшчыну, ня стала ініцыятарам соцспаборніцтва і ўдарніцтва, не дала рашучага адпору кулацкім элемэнтам і опортуністым, якія зрываюць увядзеньне зьдзельшчыны.

Кожны комсамолец павінен весьці рашэньне VI-га зьезду саветаў і давесьці яго да кожнага колгасьніка, растлумачваючы яму якую перавагу дае ўвядзеньне зьдзельшчыны для ўздыму продукцыйнасьці працы і ўмацаваньня працадысцыпліны.

Практыка работы колгасаў, якія ўжо перайшлі на зьдзельшчыну з улікам у працаднёх, паказвае вялікія перавагі. Зьдзельшчына апраўдала сябе як найлепшая форма організацыі колгаснае працы, павышэньне яе продукцыйнасьці, умацаваньня працоўнай дысцыпліны і організацыі новага колгаснага прыліву.

У комуне „Бальшавік“, Менскага раёну, да ўвядзеньня зьдзельшчыны адзін араты за 10-гадзінны рабочы дзень узорваў 0,5 га, а пры зьдзельшчыне 1 га.

Арцель „Чырвоная гаспадарка“ (Брагінскі раён) узьняла продукцыйнасьць працы аратага з 0,4 га да 0,7 га.

У арцелі „Чырвоны хлебароб“—на поліва 1 га капусты затрачвалася 5 жаночых працадзён, а пры зьдзельшчыне—2,5.

У колгасе „Прамень“, Слуцкага раёну, жняярка ў дзень нажынала 1 капу (60 снапоў), а калі перайшлі на зьдзельшчыну продукцыйнасьць працы ўзьнялася больш чым у 2 разы.

Усе гэтыя прыклады гавораць аб перавазе зьдзельшчыны, аб тым, што зьдзельшчына на 70—100 пр. уздымае продукцыйнасьць працы ў колгасах.

Гэтыя прыклады павінны стаць магутным сродкам у барацьбе за ўкараненьне зьдзельшчыны ў колгасах. Комсамольская ячэйка павінна выкарыстаць іх і шырока папулярызаваць сярод колгасьнікаў.

У барацьбе за зьдзельшчыну з улікам у працаднёх комсамол павінен быць ударным.


Дзьмітрыеў

Разьбіць опортуністычную бязьдзейнасьць

ПЕТРЫКАВА. Кампанія кантрактацыі яравых культур праходзіць вельмі маруднымі тэмпамі. Па колгаснаму сэктару замест 1681 га, законтрактавана толькі 951 га, або 55 проц. Па аднаасобнаму сэктару замест 5161 па пляну закантрактавана 2456 га або 47 проц. Плян кантрактацыі ільну па аднаасобнаму сэктару выкананы толькі на 26 проц. і канапель—на 25 проц.

Асноўнымі прычынамі зрыву своечасовага выкананьня пляну кантрактацыі зьяўляецца бязьдзейнасьць сельсаветаў і ўпаўнаважаных Райкоопсаюзу, адсутнасьць масавай работы сярод колгасьнікаў і аднаасобнікаў.

Брыгадзір „ЧЗ“ Д. Пінчук.



Падцягнуць адстаючых

СТАРЫЯ ДАРОГІ. Дадзенае заданьне па кантрактацыі яравых пасеваў па раёну выканана на 20-IУ-г. г. у індывідуальным сэктары на 82,3 проц. у калгасах—145 проц.

Па тэхнічных культурах плян выканан на 165 проц. Асабліва добра праведзена кантрактацыя у Пасяцкім сельсавеце, які выканаў заданьне на 120 проц., Нова-Дараскім сельсаветам,—на 100 проц.

Плятуцца ў хвасьце Стара-Дароскі, Крываносаўскі і Даражнянскі сельсаветы, дзе заданьне па кантрактацыі выканана на 30-40 проц.

Комсамольская організацыя слаба мобілізавана на правядзеньне гэтай кампаніі.

Л. і У.

Лічбы паказваюць твар

Вушачы. У Кубліцкім сельсавеце ўсе гаспадарча-палітычныя кампаніі праходзяць самацёкам. Гэтая опортуністычная практыка ня мінула і правядзеньне кантрактацыі. Плян кантрактацыі ільну выкананы толькі на 6,3 проц. Комсамольская ячэйка для ліквідацыі гэтага ганебнага прарыву мобілізавала свае сілы. За 7 дзён ударнай работы вылучанымі брыгадамі комсамольцаў закантрактавана каля 100 га яравых пасеваў. Але плян яшчэ ня выкананы. Трэба яшчэ больш разгарнуць ударныя тэмпы па выкананьні пляну кантрактацыі,

Комсамолец

Заданьне выканана на 100 проц.

Партыйная ячэйка фабрыкі імя Вароўскага аказала вялікую дапамогу ў правядзеньні кантрактацыі ў Пудацкім сельсавеце (Сураскі раён). Для правядзеньня гэтай кампаніі былі мобілізаваны партыйцы, комсамольцы і настаўніцтва. У выніку разгорнутай масавай работы плян кантрактацыі на 10 красавіка па ільну-валакну, бульбе і насентраў выкананы на 100 проц. Дагаворы па кантрактацыі поўнасьцю аформлены.

В. Лівер

Другую бальшавіцкую… правесьці па бальшаві…

Нанесьці руйнуючы ў… права-опортуністычна… практыцы

Плян пашырэньня ярового кл… Плешчынскаму раёну складзен… 23.103 га. С-саветы-ж скарацілі… дзеныя да іх кантрольныя лічбы… шырэньні пасеўнай плошчы. Та… прыклад, Аленішаўскі с-савет па… ну павінен пашырыць пасеўпло… 1.798 га, але скараціў гэту лічбу… 400 га. „Раённы плян не рэальн… заяўляе опортуністы гэтага с-са… Бабскі.

Плян пашырэньня плошчы пад… севам ў Акалаўскім, Каменскім… ветах не даведзены да кожнай вё… двара. Да кулацкіх заможных га… дарак не даведзены цьвёрдыя зада… па пашырэньню пасеўплошчы. У… каторых с-саветах (Акалоўскі)… не складзены яшчэ пасеўпляны.

На складах Райкоопсаюзу іржаве… больш 480 розных сельска-гаспадар… машын, а колгасы поўнасьцю не… бясьпечваюцца імі.

Рамонт сельска-гаспарчых машы… інвэнтара па колгасах не наладжа… 16 кузьнечных майстэрняў ня ма… магчымасьці абслужыць усе колг… Больш 560 плугоў яшчэ не падр… таваны да сяўбы.

У раёне сёлета павінна быць па… давана МТС, але ніякай масавай р… ты наваколі яе організацыі сярод… гасьнікаў, бядьнякоў і серадьнякоў… наасобнікаў не праводзіцца. А… Трактарцэнтру" распаўсюджваю… слаба. Замест 55 тыс. рэалізавана т… кі на 10 тыс. руб.

Стварэньне насенфондаў у ко… сах і ў аднаасобнікаў праход… вельмі марудна. Па пляну, тр… засыпаць у колгасах 38537… тнэраў насенных фондаў, з іх бул… —30 тыс. цэнтнэраў, лёну—523 ц… і г. д. На сёньня-ж засыпана то… 2495 цэнтн. Плян па стварэньню с… хавых фондаў выкананы на 10,7 п… Па лініі КСУ плян засыпкі страха… фондаў выкананы толькі на 37,7 п… Аднаасобны сэктар ня ссыпае стра… вых фондаў.

Рад сельсаветаў (Крайскі, Камен… Амнішаўскі) ніводнага кілё насен… не ачысьціў. Збожжаачышчальныя… шыны стаяць на складах і не… цуюць. Ні адзін колгас не пачаў… тручваць насеньне.

Райкоопсаюз і Райспажыўтаварыс… правалілі плян загатоўкі насеньня.

Колгасы павінны вывезьці са скл… 448 тон рознага штучнага ўгнаен… а вывезьлі ўсяго толькі 172 то… Вапна зусім ня вывозіцца.

Месячнік комсамольскай баявой т… вогі не ўскалыхнуў р-нную комсам… скую організацыю. Комсамоль… ячэйкі не распрацавалі мерапрыемс… Пленуму ЦК ЛКСМБ аб месячнік…

Брыгадзір ЦК ЛКСМБ
А. Заслаўск…

Адказваць трэба конкрэтнымі паказчыкамі барацьбы

23 сэкратары яшчэ не адказалі на запытаньні рэдакцыі

З 25 сэкратароў РК ЛКСМБ да якіх зварочвалася „Чырвоная Зьмена“ і настойліва патрабавала выступіць на старонках газэты з адказам, чаму ў іх раёнах сарвана выкананьне пляну ільназагатовак і што канкрэтна комсамол робіць, каб выканаць плян, на сёньня адказалі толькі два сэкратары,—Любаньскага і Круглянскага РК.

Аднак, іх адказы таксама нікога задаволіць ня могуць. Лісты т.т. Макарэвіча і Літвінавай наскрозь пранізаны казённым благапалучнасьцем і разважаньнямі наогул. „Абвясьцілі 10-цідзёньнік барацьбы за 100 проц. выкананьне пляну ільназагатовак“—піша Літвінава. „Зараз мобілізавалі ўсю комсамольскую організацыю і я ўпэўнены, што да выхаду ў поле плян будзе выкананы“—адказвае т. Макарэвіч.

Але, што-ж канкрэтна дасягнута у выніку 10-цідзёньніка і мобілізацыі ўсёй комсамольскай організацыі, нам і ўсёй пролетарскай грамадзкасьці не вядома.

Корэспондэнцыя юнкора Касьцюкаўца з Любаньскага раёну расказвае аб тым, што тэмпы ільназагатовак за апошні час у раёне зьнізіліся. Ці не »очковтирательство« гэта, тав. Макарэвіч?

Чакаем ад усіх сэкратароў РК адказу з конкрэтнымі паказчыкамі барацьбы комсамолу за лён

Выкананьне пляну сарвана таму, што спадзяваліся на самацёк

Плян ільназагатовак на сёньнешні дзень выкананы толькі на 25 проц. Чым гэта тлумачыцца? Па-першае тым, што самыя ўдарныя месяцы—лістапад-сьнежань прайшлі без актыўнай работы па ільназагатоўках, існавала паўнейшае спадзяваньне на самацёк. —гэта галоўнае.

Па-другое—недастаткова мобілізаваны комсамольская, партыйная і грамадзкія організацыі на ільназагатоўкі.

Цьвёрдае заданьне кулацкімі гаспадаркамі выканана толькі на 20-22 проц. Па раёну аддадзена пад суд 60 кулацка-заможных гаспадарак аднак плян здачы імі ня выконваецца.

Зусім правільна газэта абвінавачвала у тым, што ў раёне выяўлены ня ўсе кулацкія гаспадаркі. Намі зараз прымаюцца меры да выпраўленьня гэтага прарыву. Упаўнаважаныя і брыгадзіры РК КП(б)Б і ЛКСМБ працуюць у вёсках па выяўленьню кулацка-заможных гаспадарак і спагнаньню з іх цьвёрдага заданьня.

Адносна зрыву ка трактацыі і асабліва тэхкультур (ільну). Зараз мобілізавана уся комсамольская організацыя і я ўпэўнены, што да выхаду ў поле плян будзе выкананы.

З ком. прывітаньнем, сэкратар Любаньскага РК ЛКСМБ С. Макарэвіч.

ІГНАРУЮЦЬ ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ

Любань. Загатоўкі ільнавалакна насеньня ў раёне праходзяць нездавальняюча. Гадавое заданьне па загатоўцы ільнавалакна на 15-IУ—г. г. выканана на 25 проц.

Наглядаецца паслабленьне тэмпаў ільназагатовак. Апошняя пяцідзёнка дала прырост загатовак толькі на 1 проц. Загатоўчыя органы бязьдзейнічаюць, ня ведаюць і не праверaюць як выконваецца кулацка-заможнымі гаспадаркамі дадзенае ім заданьне.

Маецца шэраг прыкладаў, што кулак ня выканаў заданьня і з боку адміністрацыйных органаў ня прынята ніякіх мер.

РВК і іншыя організацыі патураюць кулаку. Кулацтва сабатуе загатоўкі.

Касьцюкавец.

АБВЯСЬЦІЛІ ДЗЕСЯЦІДЗЕНЬНІК БАРАЦЬБЫ З ПРАРЫВАМІ

Крупскі РК ЛКСМБ на запытаньне „Чырвонай Зьмены“ аб ужытых мерапрыемствах організацый ЛКСМБ па 100 проц. выкананьні пляну ільназагатовак, паведамляе:

Плян ільназагатовак выкананы на 60 проц.: колгасамі—47, па загатоўчаму сэктару—73.

Плян загатовак пянькі выкананы на 51 проц.

Дадзена цьвёрдае заданьне 110 кулацка-заможным гаспадаркам. Кулацка-заможныя гаспадаркі атрымалі заданьне ў 5138 кгр., альбо 4,2 проц. да агульнага пляну ільназагатовак.

Зараз Райком накіраваў брыгады ў дапамогу вясковым ячэйкам па колектывізацыі, якія адначасова організуюць работу па выкананьню пляну ільназагатовак і спагнаньні цьвёрдага заданьня з кулацка-заможных гаспадарак.

Сэкратар Крупскага РК КСМ Літвінава.

Ня спыняцца на дасягнутым…

ЛЁЗНА. Плян кантрактацыі… сеўнай плошчы па Калышанск… сельсавету выкананы на 99,6 п… з якіх па тэхнічных культурах—… проц. Вялікую работу па кантр… тацыі правяла комсамольская яч… ка „Профінтэрн“. Быў мобілізав… ўвесь комсамольскі актыў і суме… з актывам сельсавету партый… ячэйкі дасягнулі выкананьня п… ну кантрактацыі.

К. Кар…

Далі сустрэчны пля…

В трына. Па водле вясеньняга… сеўпляну Райколгассаюзу кол… „КІМ“ павінен засеяць 17 га іл… Колгас мае жывёлагадоўчы ў… Ня гледзячы на гэта, колгасы… на агульным сходзе высунулі… стрэчны плян пасеву ільну, па… лічыўшы раённы плян на 13 га.… ты сустрэчны плян будзе поўна… цю выкананы.

М. Латышоў

Да другой гадавіны соцспаборніцтва

У першых радох сацыялістычнага будаўніцтва

Ударная комсамольская брыгада на фабрыцы „Профінтэрн“ па рамонту швэйных машын прэміявана за ўдарную працу.

За год у брыгадзе ня было ніводнага прагулл і спазьненьня. Комсамольская брыгада паказала ўзоры сапраўды ўдарнай працы.

На здымку: комсамольская брыгада—Рэўт, Хазанаў, Лавоўскі, Петрачэнка, Казарынаў і Шметэр.

Лепшаму цэху—пераходны сьцяг

Менскі завод „Бальшавік“ разгарнуў вялікую падрыхтоўку да другой гадавіны соцспаборніцтва.

Уся падрыхтоўка ідзе пад лёзунгам шырокай популярызацыі адозвы тульскіх рабочых і організацыі новых ударных брыгад імя „518“ і „1.040“

Шырока разгарнулася ўцягненьне новых рабочых ва ўдарныя брыгады. Да 1-га мая рыхтуецца прэміраваць не лепшых ударнікаў.

Створаны пераходны сьцяг і прэмія ў 1.000 рублёў для лепшага цэху, які выйдзе з лепшымі паказчыкамі ў выкананьні прамфінпляну. Таксама адпушчана 1.500 рублёў для лепшай брыгады рамшыкаў 1-га хромавага цэху, большасьць якога складаюць комсамольцы.

Да сьвяткаваньня 2-й гадавіны социялістычнага спаборніцтва і 1-га Мая на завод прыедуць падшэфныя колгасьнікі.

З. Мінкін

Выйсьці на лінію перадавых— забясьпечыць выкананьне фінпляну 3-га рашаючага

З 5-га па 25 мая—двухдэкаднік праверкі

Пастанова Сэкрытарыяту ЦК ЛКСМБ па пытаньню аб выніках удзелу комсамольскай організацыі г. Менску ў выкананьні фінпляну за 1-шы квартал 1931 году

1. Ня гледзячы на асобныя мерапрыемствы, праведзеныя Менгаркомам ЛКСМБ у галіне мобілізацыі сродкаў Сэкратарыят ЦК ЛКСМБ адзначае, што пастановы ЦК ЛКСМБ ад 27-IX-30 году і 18-I-31 г. да гэтага часу ня выкананы, вынікам чаго зьяўляецца прарыў у выкананьні фінпляну 1-га месяцу 2-га кварталу.

Менская гар. ашчадкаса не прыстасавала сваю работу для дапамогі комсамольскай організацыі ў выкананьні ўзятых на сябе абавязацельстваў і не актывізавала ашчадапарат на сумесную работу з комсамолам па выкананьні фінпляну.

Выходзячы з гэтага, Сэкратарыят ЦК ЛКСМБ прапануе:

а) Неадкладна мобілізаваць комсамольскую організацыю, рабочую колгасную і працоўную сялянскую моладзь на ліквідацыю прарываў у выкананьні фінпляну 2-га кварталу, забясьпечыўшы яго поўнае выкананьне. На грунце пастаноў ЦК ЛКСМБ забясьпечыць выкананьне ўсіх узятых абавязацельстваў па соцыялістычнаму дагавару з комсамолам Украіны і Віцебскай арганізацыі.

б) Наладзіць сталы вучот вынікаў работы ячэек у галіне мобілізацыі сродкаў, неадкладна рэагуючы на выяўленыя прарывы.

в) Сэкратарыят ЦК прапануе адначасова з разгортваньнем працы комсамольскай організацыі па ашчаднай справе зьвярнуць належную ўвагу на важнейшыя крыніцы мобілізацыі сродкаў, як плацежы і пазыкі.

II. Улічваючы, што удзел комсамольскай організацыі ў мобілізацыі сродкаў па раду раёнаў зусім нездавальняючы, што зьяўляецца вынікам недаацэнкі важнасьці мобілізацыі сродкаў, няўменьня увязваць гэтую працу з усімі гаспадарча-політычнымі кампаніямі, у прыватнасьці у Багушэўскім, Аршанскім, Барысаўскім, Жлобінскім і Койданаўскім раёнах, Сэкратарыят ЦК прапануе усім гарадзкім раёнам неадкладна мобілізаваць усю організацыю на ліквідацыю прарываў 1-га кварталу, праверыць давядзеньне фінансавых плянаў 2-га кварталу да прадпрыемства, сяла, колгасу, ячэйкі і іх выкананьне на мясцох, забясьпечыўшы практычную дапамогу у гэтай рабоце нізавым фінансавым і грамадзкім організацыям. Гэту працу неабходна шчыльна увязаць з праводзімай вясновай пасеўкампаніяй.

III. З мэтай праверкі удзелу організацыі у мобілізацыі сродкаў, выкананьні соцыялістычных дагавораў з комсамолам Украіны абвесьціць з 5-га па 25-га мая 1931 году двухдэкаднік праверкі, прапанаваўшы усім гаркомам і ячэйкам уключыцца ў правядзеньне 2-хдэкадніка, прыцягнуўшы да актыўнага удзелу у ім усю рабочую, батрацка-бядняцкую і колгасную моладзь, „лёгкіх кавалерыстых“ і юнкораў.

Для кіраўніцтва працы па 2-хдэкадніку скласьці пры ЦК ЛКСМБ штаб з прадстаўнікоў ЦК ЛКСМБ, цэнтральнай камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадсправе пр ЦВК БССР НКФ, Кірайніцтва ашчадкасамі БССР і „Чырвонай Зьмены“

IУ. Прапанаваць Менгаркому ЛКСМ мобілізаваць для праверкі і дапамог больш адстаючым раёнам 20 комсамольцаў, адначасова абавязаўшы ўс брыгады ЦК, якія працуюць па пасеўкампаніі, прыняць актыўны ўдзел у праводзімым 2-хдэкадніку на мясцох у напрамку дапамогі РК і ячэйкам

У. Прапанаваць рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“ пачаць праверку ўдзелу комсамолу ў выкананьні пляну асьвятляючы на старонках газэты ход 2-хдэкадніку.

УI. На чарговым паседжаньні Сэкратарыяту заслухаць справаздачу 3-х райкомаў аб іх удзеле ў выкананьні фінпляну і соцдагавору з Украінай.

АДПАЧЫВАЮЦЬ

Полацак. Колектыву заводу „Труды“ было дадзена кантрольнае заданьне па рэалізацыі пазыкі „Пяцігодка—у чатыры гады“ на суму 30.000 рублёў.

Дагэтуль рэалізавана облігацый на 15.000 рублёў: заданьне выканана толькі на 50 проц.

Распаўсюджваньне пазыкі праводзілася на заводзе пакампанейску. Комсамольскі і партыйны колектывы нічога ня робяць каб выканаць на 100 проц. кантрольнае заданьне.

Мятла

Соцумову з Украінай выканаць

Петрыкаўскі раён.

Каб забясьпечыць выкананьне соцумовы з Украінай у частцы фінпляну і кантрольнае заданьне ў 2000 рублёў, Камаровіцкая ячэйка КСМ (Петрыкаўскага раёну) узяла шэфства над ашчадкасай № 24. Для штодзённага опэрацыйнага кіраўніцтва працай комсамольцаў па выкананьню фінпляну вылучана комсамольская тройка.

Агульны сход ячэйкі ўзяў самаабавязацельства, каб кожны комсамолец уцягнуў ня менш пяці укладчыкаў у ашчадкасу. У працы па мобілізацыі сродкаў насельніцтва комсамольскай ячэйцы значна дапамагае піонэрскі отрад.

Пост „Ч. З.“ А. Пялінскі

Нічога конкрэтнага ня зроблена

Шаршунская і Рагачоўская комсамольскія ячэйкі, Заслаўскага раёну, нічога конкрэтнага не зрабілі, каб выканаць свае абавязкі па мобілізацыі сродкаў насельніцтва.

Грамадзкая думка вакол гэтай працы ня складзена. Нават ня ўсе комсамольцы зьяўляюцца ўкладчыкамі ашчадкасы. Ніякай растлумачальнай працы з насельніцтвам ячэйка не праводзіць.

Такая бязьдзейнасьць ячэек у галіне мобілізацыі сродкаў ставіць пад пагрозу зрыву выкананьне соц. умовы з Украінай. Комсамольцы гэтых ячэек павінны ўзварушыць опортуністычнае кіраўніцтна ячэек, якое не зварочвае ўвагі на адказную працу—выкананьне фінпляну.

С. Бальшавіцкі.

Патрэбен не інформатар юнкор, а юнкор організатар, барацьбіт за соцыялістычнае будаўніцтва, за бальшавіцкія тэмпы

АБ ПЕРАБУДОВЕ РАБСЕЛЬКОРАЎСКАГА РУХУ

Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 16 красавіка 1931 году

1. У пэрыод соцыялістычнай рэконструкцыі народнае гаспадаркі і магутнага ўздыму творчай актыўнасьці мас у вялізарнай ступені ўзрасло значэньне рабселькораўскага руху як актыўнага правадніка генэральнай лініі партыі.

Рабселькоры, становячыся перадавымі ўдарнікамі ў барацьбе за прамфінплян і колгасна-саўгаснага будаўніцтва, зьяўляюцца „камандзірамі пролетарскай грамадзкай думкі, якія імкнуцца накіраваць невычарпальныя сілы гэтага вялічэзнага фактару на дапамогу партыі і савецкай улады ў цяжкай справе соцыялістычнага будаўніцтва“ (Сталін).

Сучасны пэрыод разгорнутага соцыялістычнага наступу ставіць перад рабселькорамі новыя, больш складаныя задачы.

Калі ў першы пэрыод разьвіцьця рабселькораўскага руху галоўная задача рабселькораў зводзілася да разаблачэньня і выкрыцьця „дробных“ недахопаў мэханізму, дык у сучасны пэрыод рабселькоры павінны значна глыбей унікаць ва ўсе важнейшыя пытаньні соцыялістычнага будаўніцтва, усебакова выкрываючы недахопы, а таксама асьвятляючы найбольш яркія станоўчыя бакі дасягненьняў соцыялістычнага будаўніцтва на ўсіх яго вучастках, пачынаючы з агрэгатаў, адзяленьняў, цэхаў, заводаў, трэстаў і г. д.

Рабселькоры становяцца пад кіраўніцтвам партыі організатарамі мас для справы соцыялістычнага будаўніцтва, выкананьня вытворчых плянаў і разгорнутага наступу на клясавых ворагаў.

2. Рабселькоры павінны дабівацца „вялічэзнай організаванасьці і дысцыпліны, рашучага палепшаньня якасьці работы ўсіх зьвеньняў дзяржаўнага, гаспадарчага, коопэрацыйнага апарату, рашучага ўкараненьня ў гаспадарчае разьвіцьцё плянавага пачатку і плянавай дысцыпліны, далейшага росту актыўнасьці і працоўнага ўздыму шырокіх мас працоўных (соцспаборніцтва, ударніцтва, сустрэчны прамфінплян)“.

Змагаючыся з недахопамі дзяржаўнага апарату, выкрываючы і ганьбячы бюрократычныя скажэньні, права і „лева“ опортуністычныя скрыўленьні лініі партыі, даючы рашучы адпор клясавым ворагам,—рабселькоры павінны поруч з гэтым разгортваць паказ дасягненьняў і перамог соцыялістычнага будаўніцтва; на ўзорах лепшых прадпрыемстваў, колгасаў, цэхаў, ударных брыгад і г. д. рабселькоры павінны паказваць прыклад адстаючым і садзейнічаць шырокаму разгортваньню абмену вытворчым вопытам на ўсім фронце соцыялістычнага будаўніцтва.

Рабселькоры павінны быць у першых радах у справе аўладаньня тэхнікай вытворчасьці, упарта змагаючыся за колькасныя і якасныя паказальнікі прамфінпляну, за ўмацаваньне гаспадарчага разрахунку і адзінаначальля, далейшае разьвіцьцё соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, выкарыстаньне ўнутраных рэсурсаў, рацыяналізацыю вытворчасьці, разьвіцьцё вынаходніцтва і г. д.

У сувязі з гэтымі задачамі павінны атрымаць шырокае распаўсюджваньне новыя формы масавай работы: рэйды, ударныя брыгады, грамадзкі буксір рацыяналізатарскія разьлікі, пераклічкі і г. д.

3. Умовай далейшага ўздыму рабселькораўскага руху і яго посьпехаў зьяўляецца перабудова работы рабселькораў.

Рабселькоры не павінны ва ўсёй сваёй рабоце абмяжоўвацца агульнымі, аднароднамі для ўсіх галін прамысловасьці задачамі, а, выконваючы гэтыя задачы (барацьба з бюрократызмам, выкрыцьцё недахопаў, выкрыцьцё хвасьцізму, рвацтва і г. д.),—усё гэта конкрэтызаваць прыстасоўна да розных вучасткаў соцыялістычнага будаўніцтва, на якіх яны працуюць.

Так, напрыклад, рабкоры вугальнай прамысловасьці павінны змагацца за мэханізацыю здабываньня, памятуючы і аб ручным здабываньні, за ўкараненьне новых, лепшых мэтодаў работы, за перанясеньне вопыту лепшых капальняў на адстаючыя; рабкоры мэталюргічных заводаў—за поўнае і рацыянальнае выкарыстаньне домен і мартэнаўскіх печаў, за своечасовую падачу і адпаведнае сартаваньне руды і інш; рабкоры транспорту—за аздараўленьне паравознага парку, якасьць рамонту, за ўмацаваньне спаранай язды, выкананьне плянаў перавозак: рабкоры новых пабудоў—за своечасовае заканчэньне будаўніцтва мантажу і пуск заводаў, якасьць пабудовы, зьніжэньне сабекошту, рацыяналізацыю і правільнае выкарыстаньне мэханізмаў, падрыхтоўку кадраў, культурнае і культурна-бытавое абслугоўваньне рабочых; рабкоры саўгасаў і МТС—за беражлівыя адносіны да трактара і сельскагаспадарчай машыны, ліквідацыю „абязьлічкі“, своечасовую сяўбу, правільную організацыю ўборкі, а таксама за вытворчую і культурную дапамогу вакольчным колгасам і сёлам.

Селькоры колгасаў павінны быць у першых радох барацьбітоў за соцыялістычную організацыю працы ў колгасах, за плянавае выкарыстаньне рабочай сілы, брыгадную работу, зьдзельшчыну, разьмеркаваньне прыбыткаў па працаднёх, перадачу вопыту перадавых колгасаў адстаючым, соцспаборніцтва, ударніцтва і г. д. Рашуча змагаючыся за суцэльную колектывізацыю і ліквідацыю на яе аснове кулацтва як клясы, селькоры павінны організаваць паказ перавагі колгасаў перад аднаасобнымі гаспадаркамі, выкрываючы манэўры кулацтва і яго агентуры ў асобе правых опортуністых і „левых“ загібшчыкаў.

4. Усямерна ўздымаючы політычную і газэтную падрыхтоўку рабселькораў даводзячы лепшых, найбольш выдатных з іх да ўзроўню кваліфікаваных журналістых, парторганізацыям і рэдколегіям газэт неабходна поруч з гэтым, уцягваючы ў рады рабселькораў новыя кадры перадавікоў рабочых і колгасьнікаў, разьвіваць цалкам апраўдаўшы сябе вопыт „Правды“ па стварэньні брыгад друку, якія зьяўляюцца ўзорам колектыўнай работы рабселькораў.

Гэтыя брыгады друку ні ў якім разе не павінны, аднак, ізоляваца ад астатняй масы рабселькораў. Яны павінны стаць кіруючым зьвяном усяго рабселькораўскага руху.

5. ЦК адзначае недастатковасьць кіраўніцтва рабселькораўскім і селькораўскім рухам, асабліва ў нацвобласьцях і раёнах, з боку партыйных організацый і рэдакцый газэт.

Неабходна ўзмацніць конкрэтнае кіраўніцтва рабселькораўскім рухам пад кутом дыфэрэнцыяцыі яго задач прыстасоўна да асобных галін прамысловасьці і сельскае гаспадаркі (нарады і зьлёты рабселькораў аднародных прадпрыемстваў, работа з рабселькорамі асобных профэсый, абгаварэньне з рабселькорамі плянаў работ газэт і г. д.).

Партыйныя і профсаюзныя організацыі не зьвяртаюць належнай увагі на нізавы вытворчы друк (друкаваныя і насьценгазэты на прадпрыемствах, у цэхах, цягнікох, саўгасах, МТС і колгасах), ня гледзячы на тое, што гэты друк набывае цяпер выключнае значэньне. Апрача сваёй ролі ў барацьбе за вытворчы плян, працоўную дысцыпліну, соцыялістычнае спаборніцтва, нізавыя газэты павінны стаць колектыўным рабкорам цэнтральных, краявых абласных і раённых газэт.

ЦК абавязвае цэнтральныя, абласныя і раённыя газэты сыстэматычна зьмяшчаць агляды завадзкіх, саўгасных і колгасных насьценных і друкаваных газэт, крытыкуючы іх памылкі і адзначаючы дасягненьні, а таксама і зьмяшчаючы найбольш каштоўны матар'ял на сваіх старонках.

6. Для кіраўніцтва рабселькорамі і нізавым друкам пры парткамітэтах павінны быць створаны камісіі ў складзе заг. культ. пропаддзелам, рэдактара газэты, прадстаўніка РСІ, пракуратуры і інструктара па друку, а пры культропах буйнейшых райкомаў—апрача таго вылучаны інструктары друку. Профсаюзы, партгабінэты, агітатары і пропагандыстыя павінны аказваць дапамогу рабселькорам і нізавому друку.

ЦК УсеКП(б) прапануе рэдактарам газэт паставіць у сур'ёз падрыхтоўку і вылучэньне лепшых рабселькораў для сталай работы ў органах друку.

7. Даручыць культропу ЦК УсеКП(б) сыстэматычна правяраць работу асобных газэт і парторганізацый з рабселькорамі, а таксама і справу выхаваньня і вылучэньня рабселькораў.

8. Даручыць „Правде“ агульнае кіраўніцтва рабселькораўскім рухам.

Дазволіць „Правде“ выдаваць раз у месяц укладку па пытаньнях работы з рабселькорамі і нізавым друкам.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна. Галоўлітбел № 599.